

ДУК "Свіслацкая раённая бібліятэка"
Аддзел маркетынгу, сацыякультурнай дзейнасці і метадычнай работы

# Краязнаўчы каляндар

## знамянальных і памятных дат на 2026 год

Свіслач, 2026

Краязнаўчы каляндар знамянальных і памятных дат на 2026 год / аддзел маркетынгу, сацыякультурнай дзейнасці і метадычнай работы ДУК “Свіслацкая раённая бібліятэка”; складальнік А.У. Рабчанка; рэдактар А.С.Шпак. – Свіслач, 2026

У распаўсюджванні гістарычных звестак аб тым ці іншым краі, людзях, якія яго праславілі, гарадах і вёсках, важная роля належыць календарам знамянальных і памятных дат. Яны ўваходзяць у склад краязнаўчых рэкамендацыйных дапаможнікаў і прызначаны бібліятэчным работнікам у дапамогу іх шматграннай краязнаўчай дзейнасці, работнікам сродкаў масавай інфармацыі і музеяў, якія займаюцца распаўсюджваннем краязнаўчых ведаў, а таксама усім, каго цікавіць гісторыя і сучаснасць роднага края.

У інфармацыйнае выданне "Краязнаўчы каляндар знамянальных і памятных дат горада Свіслач і Свіслацкага раёна на 2026 год" уключаны найбольш значныя даты з гісторыі, эканамічнага і культурнага жыцця Свіслаччыны, а таксама юбілейныя даты знакамітых ураджэнцаў і дзеячаў, якія пакінулі след у гісторыі нашага краю. Усе матэрыялы прыводзяцца ў парадку прамой храналогіі, сістэматызаваны па каляндарным прынцыпе са студзеня па снежань, у межах кожнага месяца – па чыслах. Падзеі, храналогія якіх устаноўлена толькі ў межах года, знаходзіцца ў пачатку календара.

Свіслацкая раённая бібліятэка з удзячнасцю прыме заўвагі, прапановы і дапаўненні да дадзенага выдання па адрасе: г.Свіслач, вул.Першамайская, д.4;

e-mail: lib@kultura-svisloch.by;

тэлефон 70074.

# У 2026 годзе спаўняецца:

## 1256 г. – 770 гадоў з часу першага упамінання ў пра Свіслач

Як мяркуецца, назва Свіслач мае яцвяжскае паходжанне і азначае балота, багністае месца, волкасць. Па іншай версіі, назва Свіслач звязана з ракой Вісла (Рэспубліка Польшча). Менавіта адтуль (з Віслы) рухаліся славянскія плямёны на ўсход і засялялі тэрыторыю сучаснай Беларусі. Трэцяя версія – назва паселішча ўтварылася ад назвы ракі Свіслач. Гісторыкам Свіслач вядомая з сярэдзіны XIII



стагоддзя, калі нароўні з Гродзенскім, Навагрудскім, Ваўкавыскім існавала і Свіслацкае ўдзельнае княства на чале з князем Ізяславам. Князь Ізяслаў Ізяслававіч быў пераведзены з Навагрудка ў Свіслач. Утварылася Свіслацкае княства ў Чорнай Русі. Першая згадка пра паселішча сустракаецца ў Іпацьеўскім летапісе і датуецца 1256 годам.

## 1976 г. – 50 гадоў з часу заснавання Свіслацкага гісторыка-краязнаўчага музея



Установа культуры "Свіслацкі гісторыка-краязнаўчы музей" размяшчаецца ў адным са старэйшых будынкаў горада, пабудаваным у 1907 годзе. Першапачаткова гэта была яўрэйская карчма, затым пасля Вялікай Айчыннай вайны размяшчалася гасцініца. У 1976 годзе рашэннем выканкама Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў працоўных у горадзе Свіслач быў адкрыты гісторыка-краязнаўчы музей, экспазіцыя пачала працаваць 24 жніўня 1979 года. Першая зала "Гісторыя мястэчка горада Свіслач" прысвечана гісторыі Свіслаччыны з найстаражытных часоў да 1900 года. Адна з тэм дадзенай залы прысвечана гісторыі роду Тышкевічаў: экспануецца макет Свіслачы канца XVIII пачатку XIX стагоддзя, рэканструяванай графам Вікенціем Тышкевічам з "гасціным дваром", "гімназіяй", "тэатрам", "звярынцам", "паркам", "кірмашовай плошчай". У зале таксама экспануюцца дакументы і матэрыялы аб адной з першых навучальных установаў Беларусі – Свіслацкай гімназіі, якая была адкрыта ў 1805 годзе на

сродкі і пры садзейнічанні графа Вікенція Тышкевіча. Асобнай тэмай прадстаўлены “Свіслацкі кірмаш”. Другая зала музея прысвечана ваенным падзеям, якія праходзілі ў нашым краі ў розныя перыяды гісторыі: вайна 1812 года, Першая сусветная і Вялікая Айчынная вайна. У экспазіцыі адлюстравана актуальная тэма: генацыд беларускага народа 1941-1944 гг.

## *1846 г. — 180 гадоў з дня нараджэння Івана Ігнацьевіча Кавалеўскага, служыў пісарам у Свіслачы.*

Па яго ініцыятыве і непасрэдным удзеле ў 1899 годзе была заснавана Свіслацкая агульнадаступная бібліятэка. Іван Ігнацьевіч меў гімназічную адукацыю і любіў кнігі.

## *1946 г. — 80 гадоў з дня нараджэння Валянціны Хамчук, беларускай паэткі*



Нарадзілася ў в. Навасёлкі Свіслацкага раёна. Пасля заканчэння Ваўкавыскай сярэдняй школы № 1 працавала настаўнікам нямецкай мовы. У 1969 годзе, пасля заканчэння Магілёўскага бібліятэчнага тэхнікума, працавала ў Свіслацкай раённай бібліятэцы і пісала цудоўныя вершы аб малой радзіме, аб каханні і прыгажосці роднай прыроды. У гэтым годзе Валянціне Хамчук даверылі прадстаўляць Беларусь на трэцім Усесаюзным фестывалі маладой паэзіі брацкіх рэспублік. Маладую паэзію Беларусі на гэтым фестывалі яна прадстаўляла разам з мінчанінам Рыгорам Семашкевічам. Валянціна з гонарам чытала свае вершы ў далёкім Казахстане. У 1974 годзе закончыла філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Працавала ў рэдакцыі часопіса “Маладосць”, старшым бібліятэкарам дзіцячага аддзела Дзяржынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі, была адказным сакратаром Дзяржынскай раённай арганізацыі таварыства “Веды”. Любімым заняткам Валянціны заўсёды было напісанне вершаваных радкоў. Яны выходзілі з-пад пяра паэткі ў хвіліны радасці і смутку. Зборнік лірыкі Валянціны Хамчук выйшаў у 1983 годзе пад назвай “Ветразь надзеі”. Паэзія адкрытая, усхваляваная. У вершах паэткі раскрываюцца тонкія пачуцці чалавечай душы, жаночы лёс і мацярынская любоў. Многія свае вершы Валянціна Хамчук прысвяціла роднаму краю, дзе адлюстравала хараство і прыгажосць вобразаў роднай прыроды.

## 1966 г. – 60 гадоў з часу адкрыцця ў в.Ханявічы помніка савецкім воінам і землякам, загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайне



Скульптурная кампазіцыя: воін і партызанка усталявана на месцы, дзе пахаваны 22 жыхара вёскі, 75 воінаў і 1 партызан, якія загінулі ў ліпені 1944 года ў баях за вызваленне в. Ханявічы.

## 1971 г. – 55 гадоў з часу адкрыцця ў в.Сакольнікі помніка савецкім воінам і землякам,загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайне



На паўночна-ўсходняй ускраіне вёскі Сакольнікі знаходзіцца брацкая магіла савецкіх воінаў, помнік землякам. Тут пахаваны 4 невядомыя воіны-салдаты, а таксама землякі, якія загінулі ў баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1971 годзе на магіле пастаўлена стэла з барэльефнай выявай воіна і жанчыны ў смутку.

## 1981 г. – 45 гадоў з часу адкрыцця Свіслацкага яслі-сада №2

## 1981 г. – 45 гадоў з пачатку працы ў Свіслачы Бюро тэхнічнай інвентарызацыі

## 1981 г. – 45 гадоў з часу стварэння Свіслацкай фабрыкі лазовай мэблі на базе Свіслацкага камбіната будаўнічых матэрыялаў

На фабрыцы сталі вырабляць вырабы з лазы, пераняўшы вопыт лозапляцення ў чарнігаўскіх працоўных. Прадпрыемства потым перапрафілявалася на выпуск новага асартыменту прадукцыі. На прадпрыемстве наладжаны поўны цыкл дрэваапрацоўкі. Гэта і лесанарыхтоўка, і лесапілаванне, сушка піламатэрыялаў і далейшая глыбокая перапрацоўка. Бярвенні, якія паступілі на фабрыку, праходзяць апрацоўку ў двух цэхах. У

цэху лесапілавання адбываецца распілоўка бярвення на полубрус і дошкі. Нарыхтоўкі працягваюць свой шлях далей, накіроўваючыся ў цэх дрэваапрацоўкі. Тут яны сушацца. Гатовая прадукцыя – гэта паганажныя і сталярныя вырабы: дошка падлогі, вагонка, ліштва, плінтус, дзвярныя вушакі, кроквенныя сістэмы і іншыя вырабы з бруса. Акрамя гэтага, прадпрыемства аказвае шэраг паслуг: сушка драўніны, струганне, прафіляванне, распілоўка лесаматэрыялу, а таксама рэалізацыя насельніцтву і арганізацыям аполак, апілак. У 2012 годзе фабрыка стала структурным падраздзяленнем ААТ «Гроднапрамбуд», набыўшы надзейнага памочніка і асноўнага заказчыка. Менавіта дзякуючы галаўному прадпрыемству вырабы з драўніны і дрэваматэрыялы з фабрыкі пастаўляюцца ў Астравец на Беларускую АЭС, у Гродна. Сёння ВУ “Свіслацкая фабрыка лазовай мэблі” ААТ “Гроднапрамбуд” – адно з прадпрыемстваў, якія прадстаўляюць прамысловасць раёна.






*2006 г. – 20 гадоў з часу адкрыцця ў Свіслачы новай аўтазаправачнай станцыі, укамплектаванай сучасным абсталяваннем*

*2011 г. – 15 гадоў з часу будаўніцтва станцыі абезжалезвання ў г.Свіслач*

*2011 г. – 15 гадоў з часу ўвядзення ў эксплуатацыю кальцавой дарогі вакол Нацыянальнага парку “Белавежская пушча”*

# СТУДЗЕНЬ

## 18 (1896) – 130 гадоў з дня нараджэння Борыса Баляслава, першага дырэктара Свіслацкай настаўніцкай семінарыі.

Памёр 30 мая 1927 г., пахаваны на каталіцкіх могілках у Свіслачы.

## 30 (1896) – 130 гадоў з дня нараджэння Шмыгі Івана Сцяпанавіча, ваеннага дзеяча, генерал-лейтэнанта Савецкай Арміі.



Нарадзіўся ў в.Дабраволя Свіслацкага раёна. Член КПСС з 1942 года. Закончыў ваенныя акадэміі імя Фрунзе (1931г.), Генштаба (1938 г.). У арміі з 1915 года, у Чырвонай Арміі з 1918 года. Удзельнім грамадзянскай вайны на Паўднёвым і Усходнім франтах. З 1940 года – начальнік аддзела Генштаба Чырвонай Арміі . У Вялікую Айчынную вайну з 1941 года – на Заходнім, Паўночна-Заходнім, Варонежскім і 1-м Украінскім франтах: намеснік начальніка штаба арміі, начальнік аператыўнага аддзела штаба фронта, начальнік штаба і намеснік камандуючага арміі, камандзір стралковага корпусу. Удзельнік Курскай бітвы, вызвалення Украіны, Польшчы, Чэхаславакіі. Да 1956 года працуе выкладчыкам у Ваеннай акадэміі імя Фрунзе, затым у Міністэрстве ўнутраных спраў СССР. Узнагароджаны ордэнам Леніна, медалямі.

## 30 (1956) – 70 гадоў з дня нараджэння Данілавай Ларысы Іванаўны, беларускага вучонага ў галіне эндакрыналогіі, доктара медыцынскіх навук, прафесара, выдатніка аховы здароўя Беларусі.



Нарадзілася ў г.п.Поразава Свіслацкага раёна. У 1979 годзе скончыла лячэбны факультэт Мінскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута (дыплом з адзнакай). Пасля праходжання інтэрнатуры працавала ў 1-ай гарадской клінічнай бальніцы ўрачом тэрапеўтам. У1982-1885 гадах вучылася ў аспірантуры на кафедры тэрапіі Беларускага дзяржаўнага інстытута ўдасканалення ўрачоў. У1985-1991 гадах – асістэнт

кафедры эндакрыналогіі Беларускага дзяржаўнага інстытута ўдасканалення ўрачоў. Са снежня 1991 года пасля праходжання па конкурсе загадвала лабараторыяй дыягностыкі і карэкцыі эндакрынных парушэнняў дарослага насельніцтва НДІ радыяцыйнай медыцыны і эндакрыналогіі. З 1998 года – загадчыца кафедры эндакрыналогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі. Старшыня Беларускай асацыяцыі эндакрынолагаў, член Міжнароднай федэрацыі дыябету і асацыяцыі клінічных эндакрынолагаў, Еўрапейскай асацыяцыі па вывучэнні дыябету. Узнагароджана ордэнам Пашаны, медалём Ф. Скарыны.

## САКАВІК

### *2 (1896) – 130 гадоў з дня нараджэння Гляkоўскага Станіслава Антонавіча, беларускага грамадскага і культурнага дзеяча, публіцыста, каталіцкага святара, доктара тэалогіі.*



Нарадзіўся ў мястэчку Поразава Ваўкавыскага павета Гарадзенскай губ. Паходзіў з сялянскай сям’і. У 1904-1907 гг. вучыўся ў Поразаўскай народнай навучальні. Скончыў гарадскую 4-класную навучальню ў Ваўкавыску (1913). У 1914 г. паступіў у Віленскую духоўную каталіцкую семінарыю. У пачатку 1920-х гадоў выехаў на вучобу за мяжу. Вучыўся ў папскім Усходнім інстытуце ў Рыме, дзе атрымаў ступень доктара тэалогіі. Пасвячоны ў святары ў Вільні. Пасля вяртання з Рыма служыў вікарыем у парафіі Тжцяннэ Кнышынскага дэканата і пробашчам у парафіі Трычоўка Ваўкавыскага дэканата. З 1928 г. выкладаў Закон Божы ў Віленскай беларускай гімназіі і настаўніцкай семінарыі. Прымаў удзел у заходнебеларускім рэлігійным і культурна-асветным жыцці. Пашыраў беларускую мову сярод беларусаў-католікаў, выступаў за яе шырокае ўвядзенне ў душпастырскую практыку на заходнебеларускіх абшарах. Сябра Беларускага навуковага таварыства і Беларускага каталіцкага выдавецтва ў Вільні. Выдаваў каталіцкі часопіс для дзяцей «Пралескі» (Вільня). Быў старшынёй беларускіх скаўтаў пры Віленскай беларускай гімназіі. Працаваў вікарыем у парафіі св. Яна ў Вільні. У гады Другой сусветнай вайны прымаў актыўны ўдзел у беларускім рэлігійным і культурна-асветным руху. Выконваў святарскія абавязкі пры касцёле святых Сымона і Алены.

### 18 (1921) – 105 гадоў з дня нараджэння Палубінскага Аляксандра Сямёнавіча, настаўніка, краязнаўцы, заслужанага работніка культуры БССР.



Нарадзіўся ў в. Краснае (Бераставіцкі раён). У 1940 г. вучыўся ў педвучылішчы ў г.Беласток, але закончыць яго перашкодзіла вайна. Пасля вайны скончыў Ваўкавысскае педвучылішча, Гродзенскі педагагічны інстытут імя Я. Купалы. Настаўнічаў у школах Свіслацкага раёна, 1960 г. працаваў дырэктарам школы-інтэрната, сярэдняй школы імя К. Каліноўскага ў г.п. Свіслач, раённага краязнаўчага музея, адным з арганізатараў якога быў сам. Многа зрабіў па зборы краязнаўчых матэрыялаў па гісторыі Бераставіччыны і Свіслаччыны. Пасля сябе пакінуў шмат публікацый на краязнаўчую тэматыку. Выдатнік народнай асветы, узнагароджаны медалём "За працоўную доблесць", Граматай Вярхоўнага Савета БССР.

## КРАСАВІК

### 3 (1946) – 80 гадоў з часу стварэння ў Свіслачы камунгаса.



Камунальная служба функцыянавала ў Свіслачы яшчэ з даваенных часоў. З лютага 1940 года да пачатку вайны 22 чэрвеня 1941 года ў раёне працаваў аддзел камунальнай гаспадаркі выканаўчага камітэта Свіслацкага раённага Савета дэпутатаў працоўных г.п. Свіслач. У пачатку 1960 года ў сувязі з ліквідацыяй Поразаўскага раёна да Свіслацкага аддзела камунальнай гаспадаркі далучаны Поразаўскі райкамунгас. У 1983 годзе было створана Свіслацкае раённае вытворчае аб'яднанне жыллёва-камунальнай гаспадаркі з падпарадкаваннем выканаўчаму камітэту Свіслацкага раённага Савета народных дэпутатаў. У чэрвені 1984 года праводзіцца прыёмка кацельняў, водаправодна-каналізацыйных аб'ектаў ад Ваўкавыскага прадпрыемства жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Дадаткова ўводзяцца ў эксплуатацыю аб'екты водазабеспячэння і водаадвядзення, артэзіянская свідравіна, каналізацыйна-

помпавая станцыя, ачышчальныя збудаванні, водаправодныя і каналізацыйныя сеткі. У 2000-м прадпрыемства перайменавана ў Свіслацкае раённае ўнітарнае прадпрыемства жыллёва-камунальнай гаспадаркі (Свіслацкае РУП ЖКГ). Каля вытокаў развіцця камунальнай гаспадаркі раёна стаяў Аляксандр Дзесяцік. У розныя гады яго ўзначальвалі Міхаіл Руды, Аляксандр Купрыянаў, Анатоль Жук, Віктар Акудовіч, Ігар Ласоўскі, Канстанцін Барэль, Павел Лебедзь, Уладзімір Бабіч, Сяргей Бычэк, Іван Жаркоў.

## *10 (1901) – 125 гадоў з дня нараджэння Варановіча Канстанціна Аляксандравіча, першага старшыні Свіслацкага гарсавета.*



Нарадзіўся ў Свіслачы. У перыяд Першай сусветнай вайны яго сям’я з’ехала ў Расію. У 1922 годзе Канстанцін Варановіч вярнуўся ў Свіслач, якая ўжо знаходзілася пад уладай Польшчы. Неўзабаве ён наладжвае кантакты з рэвалюцыянерамі-падпольшчыкамі, членамі КПЗБ. У канцы 1923 года ўступае ў рады Камуністычнай партыі і становіцца актыўным барацьбітом за ўз’яднанне Заходняй Беларусі з БССР. Канстанцін Варановіч уключаецца ў работу масавай рэвалюцыйна-дэмакратычнай арганізацыі “Беларуская сялянска-рабочая грамада”, праграма якой прадугледжвала ўтварэнне сялянска-працоўнага ўрада, канфіскацыю памешчыцкіх зямель і іх раздзел сярод працоўнага сялянства. Варановіч актыўна ўдзельнічаў у распаўсюджванні нелегальнай марксісцкай літаратуры, быў адным з арганізатараў забастовак працоўных лесапільных заводаў у Свіслачы, дзе сам працаваў. Удзельнічаў у рабоце беларускай секцыі агульнапольскага камітэта па падрыхтоўцы Еўрапейскага сялянскага кангрэса. У канцы 1929 года ўвайшоў у склад беларускага аддзела гэтага камітэта. З восені 1939 года Канстанцін Варановіч актыўна працаваў над устанаўленнем у раёне савецкай улады. У сакавіку 1940 года на выбарах у Вярхоўны Савет БССР і мясцовыя Саветы быў абраны дэпутатам Свіслацкага гарсавета, а на першай сесіі – старшынёй. У гады Вялікай Айчыннай вайны Канстанцін Варановіч застаўся верны сабе і свайму народу. У 1943 годзе камуніста схапілі і падвергнулі жорсткім катаванням у засценках Свіслацкай фашысцкай жандармерыі. Ворагі хацелі даведацца ў яго прозвішчы людзей, якія па яго даручэнні трымалі сувязь з партызанамі і падполлем. Пасля жорсткай экзэкуцыі ў жандармерыі яго павезлі ў Беласток у гестапа. Па дарозе Варановіч выскачыў з машыны і паспрабаваў бегчы, але фашысцкія кулі дагналі яго.

## 26 (1981) – 45 гадоў з дня нараджэння Грынкевіча Барыса Віктаравіча, майстара спорту Рэспублікі Беларусь міжнароднага класа



Нарадзіўся ў г.Свіслач Гродзенскай вобласці. Шлях у спорт пачынаўся са Свіслацкай ДЮСШ. Першы трэнер Р.Р.Яскулд. Заняў 18 месца па барацьбе вольнай у вагавой катэгорыі да 120 кг. Бронзавы прызёр маладзёжнага першынства Еўропы, удзельнік Алімпійскіх гульняў 2004 года ў Афінах (Грэцыя), 7 месца на Чэмпіянаце Свету сярод дарослых, неаднаразовы пераможца і прызёр першынстваў Беларусі па вольнай барацьбе.

# МАЙ

## 10 (1936) – 90 гадоў з дня нараджэння Рэкуць Ядвігі Іванаўны, перадавіка сельскай гаспадаркі, Героя Сацыялістычнай Працы



Нарадзілася ў в.Студзенікі Свіслацкага раёна. З 1954 года працавала ў брыгадзе па вырошчванні лёну. У 1957-2001 гг. працавала свінаркай саўгаса "Новы двор" Свіслацкага раёна. Нягледзячы на цяжкія ўмовы, пераважна ручная праца, забяспечвала адкорм да 1000 парасят у год. Авалодала ведамі ветэрынарыі, сама аказвала дапамогу парасятам, дзякуючы чаму падзеж быў зведзены да мінімуму. Стала адной з лепшых па выніках у раёне і вобласці. Увесь час перадавала свой вопыт калегам, арганізавала на ферме школу жывёлаводаў. Першай атрымала ў абслугоўванне групу племянных свінаматак новай для рэгіёна буйна-белай пароды, завезенай з Эстоніі. У 1965 годзе атрымала па 22 парасяці ад кожнай свінаматкі. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 22 сакавіка 1966 гады за дасягнутыя поспехі ў развіцці жывёлагадоўлі, павелічэнні вытворчасці і нарыхтовак мяса, малака, яйкаў, воўны і іншай прадукцыі Ядвіге Іванаўне прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы з уручэннем ордэна Леніна і залатога медаля "Серп і Молат". Працягвала працаваць свінаркай да выхаду на пенсію. У 1967-1971 гадах – дэпутат Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

## ЧЭРВЕНЬ

### 19 (1896) – 130 гадоў з дня нараджэння Алапіна Генрыха Якаўлевіча, савецкага вучонага, уролага, доктара медыцынскіх навук (1938), прафесара (1940)

Нарадзіўся ў мястэчку Свіслач. Атрымаў сярэднюю адукацыю ў Варшаве і паступіў у Харкаўскі ўніверсітэт на медыцынскі факультэт, які закончыў у 1923 г. Працоўную дзейнасць пачаў ва ўралагічным адзяленні 2-ой клінічнай бальніцы Харкава. У 1927 годзе перайшоў ва ўралагічную клініку Украінскага інстытута ўдасканалення дактароў. У 1934 годзе абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму: "Туберкулёз нырак", а ў 1940 – доктарскую – "К потогенезу нарушений азотистого обмена в тканях почки и печени при экспериментальном токсическом нефрите". У гады другой сусветнай вайны працаваў уролагам шэрагу эвакуацыйных шпіталяў. Пасля вайны вярнуўся на былое месца працы. Пад яго кіраўніцгвам напісана 15 кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый. Яго вопыт абагульнены ў 65 надрукаваных працах. Яго працы прысвечаны дыягностыцы і лячэнню туберкулёза мочаполавай сістэмы, прастаты, нырак. Неаднаразова выступаў на канферэнцыях і з'ездах уролагаў.

## ЛІПЕНЬ

### 17 (1941) – 85 гадоў з часу арганізацыі на тэрыторыі Свіслацкага раёна партызанскай групы, якую ўзначаліў член КПЗБ М.М. Болтрык.

Галоўнымі задачамі партызан былі: збіраць зброю, весці шырокую агітацыю сярод насельніцтва, барацьбу са здраднікамі, а таксама наладжваць сувязь з Вялікі зямлёй. Партызанам удалося здабыць радыёпрымач. Яны праслухоўвалі зводкі Саўінфармбюро, запісвалі іх і распаўсюджвалі сярод насельніцтва. Да восені 1941 года гурт ужо налічваў 25 чалавек.

## ЖНІВЕНЬ

### жнівень (1941) – 85 гадоў з часу арганізацыі на тэрыторыі Поразаўскага раёна падпольнай групы з былых членаў КПЗБ, якую ўзначаліў В.В. Янушка (Паддубный)



У гады Вялікай Айчыннай вайны невялікая вёска Сабалькі апынулася ў віры барацьбы з ворагам. З першых дзён акупацыі сабальчане ратавалі ад варожага палону і смерці раненых байцоў і камандзіраў. Яны пабудавалі ў лесе зямлянкі і там хавалі, лячылі народнымі сродкамі, кармілі, апраналі, узбройвалі і адпраўлялі ваеннаслужачых далей на ўсход на ўз'яднанне з Чырвонай Арміяй. Яшчэ ў ліпені 1941 года жыхары Сабалькоў стварылі першую ў раёне антыфашысцкую арганізацыю, а потым – Поразаўскі падпольны камітэт. Арганізатарам партызанскага руху быў сабальчанін Вікенцій Вікенцьевіч Янушка. У жніўні ён стварыў і ўзначаліў партызанскую групу, якая ў верасні гэтага ж года перарасла ў атрад імя Паддубнага (па падпольнай мянушцы камандзіра). Ядром атрада сталі члены антыфашысцкага камітэта, былыя члены КПЗБ, аднавяскоўцы А.С. Саўко, С.К. Куцько, Ц.М. Янушка, а таксама група савецкіх ваеннаслужачых. Да іх далучыліся і жыхары суседніх вёсак Куклічы, Рудня, Новы Двор. Партызанскі атрад Паддубнага, а затым імя Кірава, іншыя атрады імя Панамарэнкі Брэсцкага партызанскага злучэння, якія дыслацыраваліся ў пушчы, пастаянна адчувалі дапамогу жыхароў Сабалькоў. Многія жыхары з'яўляліся разведчыкамі. Для збору матэрыялаў аб праціўніку яны хадзілі ў фашысцкія гарнізоны і на чыгуначныя станцыі Ваўкавыска, Свіслачы, Поразава, Падароска. Побач з В.В. Янушкам са зброяй у руках змагаліся з ворагам і іншыя жыхары вёскі. Актыўнымі сувязнымі атрада сталі В.С. Янушка, Ф.В. Янушка, дочкі Вікенція Вікенцьевіча Янушкі – Глафіра, Яўгенія, Марыя.

## 15 (1921) – 105 гадоў з дня нараджэння Шопіка Іосіфа Іосіфавіча, майстра-ганчара



Нарадзіўся ў г.п.Поразава. Дзяцінства хлопчыка пачыналася з гліны, з якой яшчэ дзяды-прадзеды, а потым і бацька Іосіф Антонавіч стваралі разнастайныя прадметы хатняга ўжытку. Колькі сябе памятаў Іосіф Шопік у іх хаце заўсёды круцілася ганчарнае кола, на якім з'яўляліся ўсё новыя гліняныя вырабы: дахоўкі, гаршкі, макотры, гарлачы, збанкі, міскі, цацкі… Як заварожаны глядзеў маленькі хлопчык на гэтае дзіва, паціху камячачы кавалак вільготнай гліны і намагаючыся нешта зляпіць. Упершыню будучы майстар сеў за ганчарнае кола, калі пачаў да яго нагамі даставаць. Чаго ён толькі не ляпіў за сваё жыццё! Вялізныя гаршкі і "серадплякі", ёмістасцю 4-5 літраў, трохлітровыя "скляпнікі", маленькія "пітушкі", розныя мяліцы, збанкі для

захоўвання квасу, гарлачы на малако, трохногія патэльні, розныя макотры, посуд для гарбаты, кубкі для вады, вазоннікі, вазы для кветак і, вядома ж, мноства featured рознафігурных пасвісцёлак для дзяцей. “Мы – прыроджаныя ганчары”, – казаў Шопік і вельмі ганарыўся справай, якой прысвяціў усё жыццё. Менавіта вырабамі Іосіфа Іосіфавіча Шопіка, майстра чорназадымленай керамікі праславілася поразаўскае ганчарства. Іосіф Іосіфавіч быў лаўрэатам Другога Усесаюзнага фестывалю народнай творчасці, удзельнікам усесаюзных, рэспубліканскіх і абласных выстаў. Іосіф Шопік – пастаянны ўдзельнік Выстаўкі дасягненняў народнай гаспадаркі СССР у Маскве і Выстаўкі дасягненняў народнай гаспадаркі БССР у Мінску. За свае па-майстэрску зробленыя рэчы ён узнагароджаны бронзавым медалём ВДНГ СССР, шматлікімі граматамі і дыпломамі.

## ВЕРАСЕНЬ

### Верасень (1966) – 60 гадоў з часу адкрыцця ў Свіслачы дзіцячай музычнай школы.




Першы навучальны год пачаўся ў будынку, у якім зараз размяшчаецца Свіслацкі гісторыка-краязнаўчы музей. Навучанне вялося па класе трох інструментаў: фартэпіяна, баян і домра. На занятках юнакі і дзяўчаты вывучалі нотную грамату, вучыліся граць на музычных інструментах, з цікавасцю спазнавалі жыццёвы і творчы шлях вялікіх кампазітараў. Першым дырэктарам школы быў Іван Андрэевіч Барэль, ветэран Вялікай Айчыннай вайны, таленавіты арганізатар, музыка-выканаўца, педагог, аўтар інструментальных і вакальных твораў, апрацовак народных песень і танцаў. З сярэдзіны 70-х гадоў у школе адчыняюцца класы скрыпкі, трубы і акардэона. У 1984 годзе калектыў Свіслацкай музычнай школы ўзначаліў Э.С. Тарноўскі - вопытны педагог і прафесіянал сваёй справы. Гэта былі гады творчага пошуку і цудоўных адкрыццяў – адбыўся першы набор у клас флейты, быў створаны аркестр народных інструментаў. У 1993 годзе з адкрыццём мастацкага аддзялення музычная школа атрымала статут школы мастацтваў. З 1996 года школа мастацтваў працуе пад кіраўніцтвам Людмілы Іванаўны Тарноўскай. У кастрычніку 2012 года для юных талентаў гасцінна расчыніліся дзверы новага будынка Свіслацкай дзіцячай школы мастацтваў. У 2014 годзе калектыў узначаліла Марына Маратаўна Далідоўская. Па выніках абласнога конкурсу на лепшую ўстанову культуры 2015 года сярод дзіцячых школ мастацтваў калектыў Свіслацкай дзіцячай школы мастацтваў узнагароджаны дыпломам першай ступені, а ў 2016 годзе – занесены на раённую Дошку гонару.

## 3 (1731) – 295 гадоў з дня нараджэння Богуш-Сестранцэвіча Станіслава Іванавіча, беларускага вучонага, лінгвіста, палітычнага і царкоўнага дзеяча, літаратара



Нарадзіўся ў в.Занкі Ваўкавыскага павета Навагрудскага ваяводства, цяпер Свіслацкі р-н. З шляхецкай сям'і пратэстанцкага веравызнання. Дзядзька Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча. Вучыўся ва універсітэтах Кралеўца (цяпер Калінінград), Франкфурта, Амстэрдама, Лондана. Служыў афіцэрам у прускім гусарскім палку і літоўскай гвардыі. Пасля выхаду ў адстаўку (1761) працаваў хатнім настаўнікам у Радзівілаў. Скончыўшы Варшаўскую школу піараў (1763), быў настаяцелем ў Гомелі і Бабруйску, канонікам і епіскапам-суфраганам у Вільні. З 1773 года – біскуп Беларускага біскупства, з 1982 года – Магілёўскі арцыбіскуп. З 1774 года Богуш-Сестранцэвіч прыступіў да кіравання справамі епархіі. У 1778 годзе заснаваў у Магілёве семінарыю. З'яўляўся прыхільнікам ідэй гуманізму і асветніцтва, спрыяў адкрыццю школ на Беларусі, развіццю кнігаведавецкай справы. Заснаваў Магілёўскую друкарню. З 1801 года да канца дзён сваіх жыў у Пецярбургу. Апекаваўся навукай і сам працаваў у галіне гісторыі, філалогіі, медыцыны і інш. Выбіраўся членам Расійскай акадэміі навук, Пецярбургскай медыка-хірургічнай акадэміі. Акрамя заснавальніка каталіцкіх царквей, Богуш-Сестранцэвіч быў прадпрымальнікам свайго часу на Магілёўшчыне. Ён меў шмат маёнткаў, вёсак, млынаў і шынкоў у межах Магілёўскай губерні. У Магілёве ў яго была фабрыка канапаў і стулляў. У 1793 годзе выдаў у Магілёве сваю гісторыка-краязнаўчую працу "Аб Заходняй Расіі", у якой разгледзеў праблему паходжання беларусаў, украінцаў і рускіх. Аўтар "Гісторыі Таўрыды", "Гісторыі сарматаў і славян", "Граматыкі літоўскай". Напісаў, паставіў і выдаў у Магілёве вершаваную трагедыю "Гіцыя ў Таўрыдзе"(1783). Пісаў вершы, казанні і іншыя дыдактычныя творы.



## 15 (1806) – 220 гадоў з часу атрымання Свіслацкай гімназіі афіцыйную назву Гродзенская губернская гімназія ў Свіслачы

Добрая вучэбная база, выдатна падабраны склад настаўнікаў, высокі ўзровень выкладання забяспечылі

Свіслацкай гімназіі вядомую рэпутацыю. На працягу многіх гадоў яна лічылася адною з лепшых у беларускіх губернях. Жыццё ў Свіслачы, пазбаўленай шумных забаў, спрыяла заняткам гімназістаў. Настаўнікамі гімназіі былі лепшыя выпускнікі Віленскага ўніверсітэта, ураджэнцы Беларусі.

## *16 (1991) – 35 гадоў з часу стварэння нацыянальнага парку "Белавежская пушча"*




Рашэннем Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь у межах гаспадаркі ўтвораны першы ў рэспубліцы Дзяржаўны нацыянальны парк «Белавежская пушча». За захаванасць унікальнасці прыроды ў 1992 годзе рашэннем выязной сесіі ЮНЕСКА Нацыянальны парк «Белавежская пушча» быў уключаны ў Спіс Сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны чалавецтва. Гэта першы такога роду аб'ект на тэрыторыі былога СССР, які атрымаў такі высокі статус. У 1993 годзе ЮНЕСКА прысвоіў яму статус біясфернага запаведніка, уключыў яго ў адзіную сістэму гледжання за глабальнымі змяненнямі прыроднага асяроддзя. У 1997 годзе Савет Еўропы ўзнагародзіў Белавежскую пушчу Еўрапейскім Дыпломам – як адну з эталонных прыродаахоўных устаноў на кантыненце. У 2007 годзе на міжнародным форуме лідэраў (прафесіянальны конкурс «Брэнд года») Дзяржаўная прыродаахоўная ўстанова НП «Белавежская пушча» атрымала залаты медаль у намінацыі «Спадчына». У 2009 годзе Геральдычным саветам Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь зацверджаны герб і флаг НП "Белавежская пушча". У цяперашні час Дзяржаўная прыродаахоўная ўстанова Нацыянальны парк «Белавежская пушча» знаходзіцца ў падпарадкаванні Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Гэты высокі ўзровень падпарадкаванасці падкрэслівае тую ўвагу, якая ўдзяляецца ахове прыроды ў нашай рэспубліцы, пацвярджае вялікае значэнне Белавежскай пушчы як важнейшага аб'екта прыроднай спадчыны Еўропы. У Белавежскай пушчы растуць 900 відаў раслін, сустракаецца 59 відаў млекакормячых, жыве 227 відаў птушак.

## *21 (1876) – 150 гадоў з часу адкрыцця Свіслацкай настаўніцкай семінарыі*

Настаўніцкая семінарыя рыхтавала настаўнікаў у пачатковыя народныя вучылішчы, таму, клапоцячыся аб агульнай адукацыі сваіх выхаванцаў, не меншая ўвага надавалася правільнай арганізацыі практычных заняткаў у пачатковым вучылішчы, якое было адкрыта пры семінарыі менавіта для таго, каб выхаванцы маглі набываць практычныя навыкі ў вучэбнай і выхаваўчай рабоце.

## КАСТРЫЧНІК

### 1 (1991) – 35 гадоў раённая газета “Заветы Ильича” пачала называцца “Свіслацкая газета”

1 кастрычніка 1991 года раённая газета выходзіць пад новай назвай – “Свіслацкая газета”. Заснавальнікам становіцца Свіслацкі раённы Савет дэпутатаў. 22 кастрычніка 1992 года на сесіі райсавета дэпутатаў рэдактарам “Свіслацкай газеты” была зацверджана Галіна Аляксандраўна Раманчук. 12 кастрычніка 1996 года выйшаў першы нумар газеты, набраны і звярстаны на камп’ютары. Гэта быў другі падобны вопыт у вобласці. У 2001 годзе калектыў узначаліла Ядвіга Пятроўна Курыла.

## ЛІСТАПАД

### 1941 г. – 85 гадоў з часу стварэння Свіслацкага гета



З першых дзён акупацыі фашысты супраць яўрэйскага насельніцтва праводзілі палітыку праследу і тэрору. У лістападзе 1941 года немцы стварылі ў Свіслачы яўрэйскае гета (у раёне цяперашняй вуліцы Мяльнова, Камсамольскай і М. Горкага – да вуліцы Новай). Вязняў прымушалі выконваць самую цяжкую і брудную работу. Яўрэяў жорстка збівалі, у іх адбіралі рэчы і маёмасць. На іх накладвалі рознага роду “кантрыбуцыі”. Нават за невялікія правіннасці маглі расстраляць. Ва ўрочышчы Вішаўнік акупанты знішчылі 1536 свіслацкіх яўрэяў. 1 лістапада 1942 гады велізарную калону з яўрэйскага гета пад канвоем прывялі ў Вішаўнік. На месцы пакарання ўжо быў выкапаны доўгі глыбокі роў. Ахвярам загадалі распрануцца да бялізны. Затым дарослых ставілі па 10-15 чалавек у шэраг на краі ямы і расстрэльвалі з вінтовак, дзяцей забівалі прыкладамі. Экзэкуцыя пачалася каля дзвюх гадзін дня і доўжылася да позняга вечара. Каго не паспелі знішчыць у першы дзень, загналі на ноч у склеп і працягнулі крывавую расправу раніцай. Сведкі казалі, што зямля на месцы растрэлу варушылася яшчэ два дні.

## СНЕЖАНЬ

### 26 (1976) – 50 гадоў з дня нараджэння Правалінскай-Карольчык Яніны Дзіславаўны, беларускай штурхальніцы ядра, Заслужанага майстра спорту

*Рэспублікі Беларусь (2000), Алімпійскай чэмпіёнкі (2000) і чэмпіёнкі свету (2001)*



Нарадзілася ў в.Хрышчонавічы Свіслацкага раёна. У 1983-1991гг. вучылася ў Поразаўскай школе. Тут на яе звярнуў увагу настаўнік фізкультуры С.А.Шалкевіч, які прыцягнуў Яніну ў секцыю лёгкай атлетыкі, шмат і ўпарта з ёй займаўся. Па яго прапанове Карольчык накіравалі ў Гродзенскае вучылішча алімпійскага рэзерву. У 1994г. яна скончыла школу алімпійскага рэзерву і працягнула вучобу ў гэтым жа вучылішчы. У 1995г. у Санкт-Пецярбургу на спартакіядзе народаў СНД па лёгкай атлетыцы Яніна стала чэмпіёнкай па кіданні дыска. У штурханні ядра была другой. Скончыўшы вучылішча і атрымаўшы сярэднюю спецыяльную адукацыю, яна стала трэнерам па лёгкай атлетыцы. У тым жа 1996г. паступіла ў Акадэмію фізічнага выхавання і спорту Рэспублікі Беларусь. На чэмпіянатах Еўропы (Фінляндыя – 1997г., Венгрыя – 1998г.) у штурханні ядра была бронзавым прызёрам. У 1999г. Яніна Дзіславаўна на чэмпіянаце свету ў Іспаніі заняла чацвёртае месца ў штурханні ядра. У 2000г. у Сіднэі (Аўстралія) на 17-ых Алімпійскіх гульнях стала алімпійскай чэмпіёнкай. Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 13 кастрычніка 2000г. Яніна Дзіславаўна Карольчык узнагароджана Ордэнам Айчыны III ступені, ёй прысвоена ганаровае званне “Заслужаны майстар спорту Рэспублікі Беларусь”. 5 жніўня 2001г. на чэмпіянаце свету ў канадскім горадзе Эдманце Яніна Карольчык да тытула алімпійскай чэмпіёнкі дадала яшчэ і тытул чэмпіёнкі свету.